# СОВЕЦКАИ ТУРКМЕНІІ—10 ГОД

## Прывітанне брацкай рэспубліцы

### *Старшыні ЦВК—АИТАКАВУ*
### *Старшыні Соўнаркома—АТАБАЕВУ*

У дзень 10-годдзя Туркменскай ССР Совет Народных Камісараў Беларусі ад імя рабочых, калгаснікаў і працоўных Совецкай Беларусі, будуючых соцыялізм на заходніх граніцах соцыялістычнай бацькаўшчыны, шле брацкае прывітанне і гарачае віншаванне рабочым, калгаснікам і ўсім працоўным Туркменскай ССР.

Працоўныя Туркменіі ў мінулым бязлітасна эксплоатаваліся баямі, дзіка прыгняталіся і рабаваліся апрычнікамі царскай Расіі.

Толькі Окцябрская соцыялістычная рэволюцыя раз і назаўсёды вызваліла ад эксплоатацыі раней прыгнечаны туркменскі народ і дала магчымасць працоўным Туркменіі пры брацкай дапамозе ўсяго Совецкага Саюза і пад яго кіраўніцтвам заняць сваё ганаровае месца ў вялікім многанацыянальным Саюзе Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік і дабіцца вялікіх перамог у справе соцыялістычнага будаўніцтва.

Поспехі і дасягненні Туркменскай ССР ва ўздыме эканомікі і культуры працоўных Туркменіі — ёсць прамы рэзультат і трыумф ленінска - сталінскай нацыянальнай палітыкі, рэзультат правільнага сталінскага кіраўніцтва нашай партыі.

Соўнарком Беларусі жадае ў далейшым рабочым, калгаснікам і ўсім працоўным Туркменіі поспехаў у плёдатворнай работы па будаўніцтву соцыялізма.

Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў, пад кіраўніцтвам правадыра рабочага класа і комуністычнай партыі вялікага СТАЛІНА працоўныя Туркменіі разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза завершаць пабудову бескласавага соцыялістычнага грамадства.

Няхай жыве арганізатар вялікіх перамог — слаўная партыя большэвікоў!

Няхай жыве правадыр, друг і настаўнік працоўных усяго свету— СТАЛІН!

СТАРШЫНЯ СОЎНАРКОМА БССР

ГАЛАДЗЕД.

22 лютага 1935 г.

СНК БССР.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ